нию и развитию белорусской народной культуры и любительского кукольного театра (выставки, фестивали, смотры-конкурсы и др.), а также традиций самобытной батлейки (реконструкция старинных батлеек, мастер-классы и др.).


1. *Мацкела, Л.* «Кошчын дом» і Месяц пажарнай бяспекі / Л. Мацкела // Культура. – 2008. – № 11 – 15 сакав. – С. 12.

2. *Стасюкевич, Е.* В усадьбе Огинских Залесье в 2015 году проведут международный фестиваль театров-батлеек / Е. Стасюкевич // «БЕЛТА – Новости Беларуси» [Электронный ресурс]. – 2014. – Режим доступа : http://www.belta.by/ru/all_news/culture/V-usadbe-Oginskih-Zalesje-v-2015-godu-provedut-mezhdunarodnyj-festival-teatrov-batleek_i_685914.html. – Дата доступа : 13.11.2014.

3. *Струнчанка, А.* Лялечны онлайн / А. Струнчанка // Культура. – 2014. – № 46. – 15 ліст. – С. 13.



***В. А. Касап,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры тэорыі і гісторыі*
*інфармацыйна-дакументных камунікацый*


# ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ ГАЛІНОВАЯ СТРУКТУРА ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ПАСЛУГ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК СУБ’ЕКТАМ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ

У сучасных умовах спецыяльныя навукова-тэхнічныя бібліятэкі імкнуцца ў поўным аб’ёме забяспечыць неабходнай інфармацыяй усіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу ў галінах прамысловасці, сельскай гаспадаркі, медыцыны і інш. У якасці карыстальнікаў інфармацыі ў гэтых бібліятэках выступаюць арганізатары адукацыйнага працэсу, выкладчыкі, якія забяспечваюць змест выкладання розных дысцыплін, навучэнцы (студэнты, магістранты), аспіранты, а таксама тыя спецыялісты, якія па ўласным жаданні ці ў сувязі з вытворчай неабходнасцю змяняюць прафесію, праходзяць павышэнне кваліфікацыі ці перакваліфікацыю. Статыстычныя даныя колькасці чытачоў сведчаць аб павелічэнні гэтай групы наведвальнікаў бібліятэк. Для карыстальнікаў спецыяльных навукова-тэхнічных бібліятэк неабходны прадукты і паслугі, разлічаныя на розныя мэты звароту да бібліятэкі, віды і этапы адукацыйнага працэсу.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У апошні час бібліятэкі прытрымліваюцца сервіснага падыходу да аказання інфармацыйных паслуг карыстальнікам, які ўключае адпаведныя адносіны да іх як да вышэйшай прафесійнай каштоўнасці, правядзенне дыягностыкі ўзроўню арганізацыі інфармацыйнага абслугоўвання, забеспячэнне правоў карыстальнікаў на якасны інфармацыйны прадукт, пастаяннае вывучэнне задаволенасці якасцю абслугоўвання і інш. Шырокае выкарыстанне аўтаматызаваных тэхналогій падрыхтоўкі і распаўсюджвання інфармацыйнай прадукцыі прывяло да зменаў у наменклатуры, відавым складзе і тэхналогіі аказання інфармацыйных паслуг удзельнікам сістэмы бесперапыннай адукацыі. Для сучаснага этапу аказання інфармацыйных паслуг спецыялістам навукова-тэхнічнай і медыцынскай сфер характэрны: інтэлектуалізацыя, ускладненне запытаў карыстальнікаў, якія звязаны з іх міжгаліновай дзейнасцю, вырашэннем інавацыйных праблем; пастаяннае павелічэнне аб’ёму патоку інфармацыі пры зніжэнні яе рэцэптурнасці; хуткія тэмпы старэння інфармацыі і страта яе актуальнасці; пашырэнне тэматычных міжінфармацыйных патрэбнасцей удзельнікаў адукацыйнага працэсу; неабходнасць выкарыстання ведаў і прафесійнага вопыту з іншых сфер дзейнасці. Акрамя названых значны ўплыў на інфармацыйныя паслугі аказваюць новыя тэхналогіі і інфармацыйнае асяроддзе, у якім пачынае працаваць сучасная бібліятэка, так званае асяроддзе бібліятэка 2.0. [3]. Аналіз інфармацыйных паслуг спецыяльных бібліятэк у асяроддзі бібліятэка 2.0 раней не разглядаўся.

Пад інфармацыйнай паслугай часцей разумеюць інфармацыйную дзейнасць па давядзенні да карыстальніка інфармацыйнай прадукцыі, якая ствараецца ў пэўнай форме і даводзіцца ў пэўным рэжыме. Праблема азначэння, аналіза і класіфікацыі бібліятэчна-інфармацыйных паслуг закраналася ў працах М. Я. Дворкінай [2], В. В. Брэжневай і В. А. Мінкінай [1], іншымі спецыялістамі. Яны прапанавалі шматаспектную класіфікацыю інфармацыйных паслуг зыходзячы з перыядычнасці абслугоўвання, месца і спосабу аказання інфармацыйных паслуг, характару прадстаўленай інфармацыі і інш. Прапанаваныя прызнакі з’яўляюцца «класічнымі», якія неабходна ўдакладняць зыходзячы з сучасных фактараў развіцця інфармацыйных паслуг у бібліятэках.

Сёння бібліятэкі выходзяць у інфармацыйныя сеткі, сацыяльныя медыа з прапановамі сваіх паслуг, інфармуюць карыстальнікаў аб перавагах інфармацыйнага пошуку ў онлайн базе дан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных (БД), фарміруюць даведачныя фонды сеткавых рэсурсаў. Гэтаму спрыяюць фактары развіцця інфармацыйнай прасторы: доўгатэрміновыя сувязі паміж бібліятэкай і суб'ектамі сістэмы бесперапыннай адукацыі, стварэнне рынку інфармацыйных прадуктаў і паслуг, збор, захаванне і прадастаўленне інфармацыі для розных відаў адукацыйнай дзейнасці, а таксама яе перапрацоўка і фарміраванне новых ведаў.

Прысутнасць бібліятэк у сетках прывяла да фарміравання новых паслуг, заснаваных на інтэрактыўных сервісах (блогаў, вікі, «жывых часопісаў», сацыяльных сетак і інш.). Спецыялісты таксама называюць форумы, гасцявыя кнігі, тэгіраванне, падкасты і іншыя сервісы. Сучасная інфармацыйная паслуга − гэта фізічная ці віртуальная паслуга са зваротнай сувяззю, якая акумуліруе кантэнт і ствараецца сумесна карыстальнікам і супрацоўнікам бібліятэкі ці некалькімі суб'ектамі. Напрыклад, калі ў тэкст, выстаўлены на сайце бібліятэкі, дабаўляюцца спасылкі на рэсурсы Інтэрнэт, заўвагі, бібліяграфічныя спасылкі на дакументы, прадметныя рубрыкі, класіфікацыйныя індэксы.

Галіновыя рэспубліканскія бібліятэкі толькі пачынаюць выкарыстоўваць сучасныя сервісы для інфармацыйнага абслугоўвання суб'ектаў сістэмы бесперапыннай адукацыі. Напрыклад, БелСГБ прадастаўляе доступ да інфармацыйных рэсурсаў па сельскай гаспадарцы і сумежных галінах, ажыццяўляе навігацыю па сусветных і нацыянальных web-рэсурсах, вядзе карпаратыўны электронны інфармацыйны бюлетэнь «БелСГБ: навіны, падзеі, каментарыі». На сайце РНТБ прыведзены спіс блогаў бібліятэк Беларусі, сярод якіх названы блогі РНТБ і яе Брэсцкага філіяла. У блогу размешчана інфармацыя аб цікавых выставах, якія праходзяць у бібліятэцы, спасылкі на сайты бібліятэк, запрашэнне на рэспубліканскія семінары і навуковыя кафэ. Рэспубліканскія галіновыя бібліятэкі і навукова-тэхнічныя бібліятэкі ўстаноў вышэйшай адукацыі маюць старонкі у сацыяльных сетках «В контакте», «Фэйсбук» і інш. Гэтыя факты дазваляюць прапанаваць у пералік прызнакаў класіфікацыі інфармацыйных паслуг суб'ектам сістэмы бесперапыннай адукацыі такія, як від і этап адукацыйнага працэсу, выкарыстанне сацыяльных медыа пры аказанні інфармацыйных паслуг. Гэта праблема з'яўляецца дастаткова актуальнай і патрабуе глыбокага даследавання.

Такім чынам, пры аналізе інфармацыйных паслуг бібліятэк суб'ектам сістэмы бесперапыннай адукацыі акрамя традыцый-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных (дакументных, навінных, арыентуючых, даследчыцкіх, даведачных) неабходна ўлічваць форму і месца аказання паслуг, магчымасці стварэння інфармацыйнага прадукту сумесна з суб'ектамі адукацыйнага працэсу, магчымасці захавання інфармацыйнага прадукту ў вызначаным месцы з доступам іншых карыстальнікаў і яго папаўнення.

1. *Брежнева, В. В.* Информационное обслуживание: продукты и услуги, предоставляемые библиотеками и службами информации предприятий / В. В. Брежнева, В. А. Минкина. – СПб. : Профессия, 2004. – 304 с.
2. *Дворкина, М. Я.* Информационное обслуживание: социокультурный подход / М. Я. Дворкина. – М. : Профиздат, 2001. – 112 с.
3. *Масловская, А.* Интерактивные сервисы библиотеки: вопросы учета / А. Масловская // Бібліятэчны свет. – 2014. – № 4. – С. 7–8.

***І. П. Клімаў,***
*кандыдат філалагічных навук,*
*дацэнт кафедры беларускай філалогіі*
*і сусветнай літаратуры*

## ПРАБЛЕМА СУТНАСЦІ РЭЛІГІІ (У ПРАЦАХ ЗАХОДНІХ ВУЧОНЫХ)

Рэлігіі, што сустракаюцца ва ўсіх вядомых грамадствах, уяўляюць сабой нейкі ўніверсальны феномен. Існуе нямала дэфініцый рэлігіі, але агульнапрынятай у навуцы пакуль няма; у дадзенай працы рэлігія разглядаецца як від ідэалогіі.

Рэлігія – гэта від ідэалогіі (сістэматызаванага светапогляду), ненавуковай і пазарацыянальнай, на падставе чаго чалавек арганізуе ўласныя паводзіны (у т. л. у прыватным, штодзённым жыцці), спецыфічныя дзеянні (культ, рытуал і пад.) і спецыяльныя інстытуты і аб'яднанні (напрыклад, секту, царкву і інш.). Гэтай ідэалогіі ўласцівы пэўныя паняцці, якія вылучаюць і адрозніваюць яе ад іншых ідэалогій (напрыклад, філасофіі, нацыяналізму) і астатніх чалавечых уяўленняў наогул (напрыклад, веры ў навуку ці прагрэс). У псіхафізіялагічным аспекце асновай для рэлігіі служаць уяўленні, ідэі (перакананні) і вопыт (рэальны ці меркаваны) чалавека, а таксама некаторыя яго псіхічныя станы і здольнасці (памяць, фантазія, мроя, сон, галюцынацыя, ілюзія і інш.) [6, p. 371; 1, p. 362–363]. Гэта дае чала-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ